Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

# Гульня-віктарына
# для вучняў 4 класа
# **“Пагавары са мной на роднай мове”**

Настаўнікі-дэфектолагі
Н.А.Цімашчук
Г.П. Пратасевіч

**Гульня-віктарына для вучняў 4 класа**
**“Пагавары са мной на роднай мове”**

Задачы:
Садзейнічаць узбагачэнню мовы навучэнцаў, узбагачаць іх слоўнікавы запас, актывізаваць маўленчую дзейнасць;
Ствараць умовы для развіцця пазнавальнай і інтэлектуальнай дзейнасці, іх творчых уяўленняў і здольнасцей;
Узбагачаць слоўнікавы запас вучняў актывізаваць іх маўленчую дзейнасць;
Выхоўваць любоў да роднай мовы.

Ход мерапрыемства
Скажыце, калі ласка, у якой краіне мы жывём?
Як называецца мова, на якой мы размаўляем?

*Гучыць песня "Беларуская мова" (у выкананні гурта "Дразды")*
*https://www.youtube.com/watch?v=20vBM6YnFLg*

*Вядучы.* А вы ведаеце, што сёння у нашым свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моў. Наша беларуская мова абаронена заканадаўствам і з’яўляецца, разам з рускай, дзяржаўнай мовай краіны.
Класік беларускай літаратуры Якуб Колас пакінуў усім нам такі запавет: "Трэба любіць, ведаць і шанаваць мову свайго народа і ўмець дасканала валодаць ёю".
І сёння мы з вамі будзем выконваць заданні на беларускай мове.

1. Заданне “словы ветлівасці”

Калі мы вырашылі размаўляць на беларускай мове, то ў першую чаргу мы павінны ведаць ветлівыя словы на беларускай мове. У нашай мове ёсць шмат слоў, якія узнімуць настрой людзям.
І так, пачынаем…

Сёння цёпла, ці сцюдзёна,
Ці надвор’е – проста дрэнь,
Не зважаючы на гэта,
Усім кажыце… (“Добры дзень”)

Прывітанне сябрам і дарослым,
Прывітанне - з пашанай і ўзнёсла,
Ці ў школу вы прыйшлі, ці на спатканне,
Можна усім тут сказаць : .... ("Прывітанне!")

Калі выходзіце вы з дому,
Сустрэч па заканчэнні,
Тады кажыце вы, вядома,
Усім: ...... ("Да пабачэння!")

Сняданак, полудень, вячэра,
З сям'ёй вы дома альбо дзесьці,
Усім прысутным без паперы
Сказаць патребна: .... ("Смачна есці!")

Камусьці ў метро на нагу наступілі,
Штурхнулі суседа, кагось зачапілі,
Вы не грубіян і не злодзей – не плачце.
Сказаць дастаткова бывае: .... ("Прабачце")

Цацкі ўсе даўно паснулі,
Спяць бабуля і дзядуля,
Спаць кладуцца тата, мама,
Пажадаем ім:...... ("Дабранач!")

Калі вам падораць кветку,
Прынясуць прысмакі,
Скажуць камплімент. На гэта
Адказаць вам трэба: ... ("Дзякуй!")

Калі патрэбна дапамога
Звярнуцца трэба мо да кога,
Вось вам маленькая падказка -
Заўжды кажыце: ....... ("Калі ласка!")

2. Заданне "Куфэрак слоў"

Прапаную папрактыкавацца ў перакладзе слоў з рускай мовы на беларускую. Вы будзеце па чарзе выцягваюць з куфэрка паперку,чытаць словы і перакладаць іх.

| Заданне | Адказ | Заданне | Адказ |
|---|---|---|---|
| Звезда | Зорка | Скатерть | Абрус |
| Кукушка | Зязюля | Занавески | фіранкі |
| Кровать | Ложак | Блюдце | Сподак |
| Вилка | Відэлец | Сковорода | Патэльня |
| Петух | Пеўнік | Клёст | Крыжадзюб |
| Туча | Хмара | Аист | Бусел |
| Ложка | Лыжка | Черёмуха | Чаромха |
| Гроза | Навальніца | Словарь | Слоўнік |
| Зубная боль | Зубны боль | Серый гусь | Шэрая гусь |
| Главный приз | Галоўны прыз | Моя фамилия | Маё прозвішча |
| Гнездо аиста | Буслянка | Стеклянная | Шкляны слоік |
| Диван | Канапа | банка | |
| Отыскать | Адшукаць | Ковёр | дыван |
| Ужинать | Вячэраць | Пробовать (еду) | Каштаваць |
| Комната | Пакой | Завтракать | |
| Деревянный | Драўляны | Этаж | Снедаць |
| | | Кирпичный | Паверх |
| | | | Цагляны |

3. Заданне "Словы-хітруны"

Вам неабходна растлумачыць значэнне хітрых слоў беларускай мовы. Я прапаную чатыры варыянты адказаў. Толькі адзін правільны. І так, увага

Касач – спявае, плыве, расце, лятае? *Касач расце (Ирис)*

Кажан – спявае, расце, плыве, лятае? *Кажан лятае. (Летучая мышь)*

Абібок – чалавек, звер, птушка, грыб? *Абібок – чалавек. (Лодырь, лентяў)*

Трускалкі – гульня, ягады, жукі, танцы? Трускалкі – ягады. (*Клубника*)

Абабак – цацка, птушка, грыб, чалавек? Абабак – грыб. (*подберёзовик*)

***"Метаграмы"***

- З **м** расту я на градзе.

З **р** я поўзаю ў вадзе.

*(Мак — рак.)*

- У лесе з **б** мяне шукаеш

І з прыемнасцю зразаеш.

Калі **б** на **п** заменіш —

Сцеражыся: захварэеш!

*(Грыб — грып.)*

• З **п** — я пад тваёй пятою
Паскараю табе шлях.
З **м** — зазвычай у героя
Горда ззяю на грудзях.
*(Педаль — медаль.)*

• З **е** дружу з будаўнікамі.
З **а** куплялі ў хлебнай краме.
*(Бетон — батон.)*

***“Моўная скарбонка”***

вядучы прапануе апісанне значэння слова, вучням трэба яго адгадаць

Машына для размолвання зярнят. *(Млын.)*

Свята, калі дарослыя пякуць бліны, а дзеці катаюцца на санках, арэлях. *(Масленіца.)*

Вусная народная творчасць. *(Фальклор.)*

5. Заданне "Паштоўка Фразені"

Вам паштоўка прыйшла з краіны беларускіх фразеалагізмаў ад Фразені - знаўцы вобразных выразаў. Фразеня марыць, каб вы, хлопчыкі і дзяўчынкі, узбагачалі свой слоўнікавы запас фразеалагізмамі і правільна іх выкарыстоўвалі ў розных сітуацыях зносін. Паслухайце, калі ласка, пажаданні: "Паважаныя сябры! Жадаю, каб кожны з вас адчыніў акно ў свет, быў усюды сваім братам, ніколі не адчувай сябе не у сваёй талерцы, заўсёды трымаў хвост абаранкам. Хай усе вашы справы пойдуць як па масле. І тады вы заткняце за пояс кожнага, у каго вецер у галаве". А вось і заданне: кожны устойлівы выраз утрымлівае ў сваім складзе назвы частак цела чалавека, дапоўніце выразы патрэбнымі словамі.

| Заданні | Адказы |
|---|---|
| Вадзіць за | Вадзіць за нос. |
| Куды … глядзяць. | Куды вочы глядзяць. |
| У адно … ўлятае, у другое вылятае. | У адно вуха ўлятае, у другое вылятае. |
| ...... да зубой прымёрз. | Язык да зубой прымёрз. |
| Кляваў … | Кляваў носам. |
| З першых … | З першых вуснай. |
| Не было ў … макавай расінкі. | Не было ў роце макавай расінкі. |
| Вецер у … | Вецер у галаве. |

| | |
|---|---|
| За … не насіць. | За плячамі не насіць. |
| Як … зняло | Як рукой зняло. |

IV. Рэфлексія.

Кожны ўдзельнік працягвае сказ:

- Я даведаўся...
- Я змагу...
- Мне спатрэбіцца...

Потым ацэньвае свае дасягненні:

- У мяне атрымалася...
- Мне было цяжка...
- Мне спадабалася...
- Я хачу пахваліць... за...

Вядучыя дзякуюць усім за удзел

| | | |
|---|---|---|
| Звезда | Скатерть | Серый гусь |
| Кукушка | Занавески | |
| Кровать | Блюдце | Кирпичный |
| Вилка | Сковорода | Этаж |
| Петух | Клёст | Завтракать |
| Туча | Аист | Ковёр |
| Стеклянная банка | Главный приз | Зубная боль |
| Гнездо аиста | Моя фамилия | Пробовать (еду) |
| Ложка | Черёмуха | Диван |
| Гроза | Словарь | Отыскать |
| Ужинать | Комната | Деревянный |

Касач –
спявае, плыве, расце, лятае?
Кажан –
спявае, расце, плыве, лятае?
Абібок –
чалавек, звер, птушка, грыб?
Трускалкі –
гульня, ягады, жукі, танцы?
Ababak –
цацка, птушка, грыб, чалавек?

Касач –
спявае, плыве, расце, лятае?
Кажан –
спявае, расце, плыве, лятае?
Абібок –
чалавек, звер, птушка, грыб?
Трускалкі –
гульня, ягады, жукі, танцы?
Абабак –
цацка, птушка, грыб, чалавек?

| Заданні |
|---|
| Вадзіць за |
| Куды … глядзяць. |
| У адно … ўлятае, у другое вылятае. |
| ...... да зубой прымёрз. |
| Кляваў … |
| З першых … |
| Не было ў … макавай расінкі. |
| Вецер у … |
| За … не насіць. |
| Як … зняло |

| Адказы |
|---|
| Вадзіць за нос. |
| Куды вочы глядзяць. |
| У адно вуха ўлятае, у другое вылятае. |
| Язык да зубой прымёрз. |
| Кляваў носам. |
| З першых вуснай. |
| Не было ў роце макавай расінкі. |
| Вецер у галаве. |
| За плячамі не насіць. |
| Як рукой зняло. |